Цана аддзельнага нумару у розьнічнай продажы 3 кап.

Пролетары усіх краеў, злучайцеся!

Газэта сялянскай моладзі
Малады Араты

Падпісвайся на МАЛАДЫ АРАТЫ!

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
У месяц 12 кап.

ПАДПІСНУЮ ПЛАТУ адпраўляць па адрасу: МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63, Беларускае ДЗЯРЖ. ВЫДАВЕЦТВА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, Комсамольская 25—тэл. 294.

№ 1 (97) Орган Цэнтральнага Камітэту ЛКСМБ. Серада 14 студзеня 1925 г. № 1 (97)

Пойдзем па шляху Леніна.

Няма нікога, хто ня чуў імя Леніна. Маладыя рабочыя ведаюць,—гэта Ільліч правеў рабочую клясу праз доўгі, цяжкі шлях і прывёў да Кастрычніка; гэта Ленін быў галоўным плотнікам савецкай будоўлі; гэта ён праз фронты, праз страты і голад прывеў саюз савецкіх краін да цяперашняй магутнасьці.

Моладзь вёсак ведае: з Ільлічом на чале, бальшавікі перамаглі паноў і аддалі сялянам зямлю; замацавалі яе за працоўным сялянствам, зрабілі моцным і нярухомым саюз рабочых і сялян.

Вось які шлях Леніна, вось які шлях Ленінскай партыі бальшавікоў: гэта шлях усяго працоўнага народу праз голад і вайну—да новага жыцьця, праз страты—да шчасьця, праз цяготы ў мучэньні—да комунізму.

Ленін сам быў непараўняным прыкладам таго, што значыць быць комуністым.

Старайцеся быць такімі, як Ленін.

Ільліч патрабуе ад нас, каб лічылі будаўніцтва комунізму задачай усяго жыцьця нашага пакаленьня. Але ён сам паказаў, як можна цэлае, доўгае жыцьцё да апошняга ўздыху аддаць гэтай вялікай задачы. Ільліч кліча нас прэч ад кніжнай зуброўкі—хоцьбы і па комуністых кніжках,—да вучобы, якая цесна зьвязваецца з працай і барацьбой. Але ці не яго Ленінскае научэньне цалком вырасла з практыкі барацьбы рабочай клясы і разам з рабочым рухам развярачвалася і мацнела. Ленін перасьцерагаў нас ад пакорнага ўразуменьня гатовых вынікаў; ён вучыць нас пераараць думкай усе багацьці ведаў, якія зазастаўлены нам у спадчыну гібнучымі клясамі. Вось які Ленінізм, які ўвабраў у сябе ўсё, што было каштоўнага для ўсіх працоўных, у скарбніцы людзкіх ведаў. Які бязьлітасна вёў барацьбу з букваедзвам і прыняцьцем праўды навеpу. І дзеля гэтага ён зрабіўся сапраўднай комуністычнай навукай аб тым, як перамагаюць.

Згодна Ленінскім запаведзям, трэба яшчэ і яшчэ праверыць свой крок.

Ленін Уладзімір Ільліч.

Ул. І Ленін радзіўся ў 1870 годзе, 10 красавіка, у г. Сімбірску.

Ленін жыў 53 гады, в іх 30 год афяраваў ён на карысць рэволюцыйнага пролетарскага руху.

Бацька Леніна працаваў на Волзе дырэктарам пачатковых (народных) школаў.

Матка Леніна памерла ў 1913 годзе.

Цар Александра III-ці прысудзіў да кары сьмерці старэйшага брата Леніна,—Александра Ульянава.

Пасьля сканчэньня гімназіі Уладзімір Ільліч залічыўся на юрыдычны факультэт Казанскага ўніверсытэту. Сталічныя для яго былі зачынены, толькі затым, што ён быў братам прысуджанага да сьмерці Александра Ульянава.

Аднак студэнтам Ул. І пабыў нядоўга, праз месяц яго выключылі з універсытэту за ўдзел у рэволюцыйным студэнцкім руху. Толькі праз 4-ры гады Ленін атрымаў магчымасьць здаць залікі.

Выключаны з Казанскага у-ту Ленін паехаў у „Пецярбург“ дзе шукаў марксыстаў. У той час марксыстаў трэ было „днём шукаць з агнём“.

У той час народнікі кіравалі розумам тагочаснае інтэлігэнцыі (рабочая кляса толькі прасыпалася да рэволюцыйнага жыцьця).

Не прайшло 2-х гадоў жыцьця ў Пецярбурзе, як Ленін стварае рабочыя гурткі і аб'яднае наўкола сябе першаю групу інтэлігэнтаў—марксыстаў.

Ленін разам з другімі дзеячамі-марксыстамі стварае ў Пецярбурзе «Союз борьбы за освобождение рабочего класса».

У канцы 1895 г. саюз быў арыштаваны, распушчаны, а Уладзімір Ільліч трапіў ў турму, адкуль у 1897 г. быў адпраўлены ў ссылку ў Сыбір, дзе ён напісаў цэлы шэраг навуковых кніг па рэволюцыйнаму руху. З Сыбіру Ленін разам з Мартавым і Патрэсавым паехаў заграніцу, дзе разам з імі выдаваў газэту «Іскра».

Гэта газэта згуртавала ўсіх марксыстаў, праз гэту газэту рэшта людзей даведалася аб Леніне, як правадыру пролетарыяту.

У 1903 годзе партыя раскалолася на бальшавікоў і меншавікоў. Гэты раскол быў падрыхтаваны Ленінам, каб пазбавіцца ад згодніцкіх з буржуазіяй элементаў і т. зв. опортуністаў. Ён разьбіваў меншавіцкае вучэньне і прадсказываў іх еднасьць з буржуазіяй.

Значную організацыйную ролю Ленін сыграў ў рэволюцыі 1905 году. Яго палітычныя артыкулы, брашуры, лістоўкі давалі належны кірунак рэволюцыйнаму змаганьню рабочай клясы. У канцы 1905 г. Ленін вяртаецца ў Расію,—пабыўшы 5 год у эміграцыі, каб непасрэдна кіраваць рабочым рухам.

Ён меў сувязь з паўстаньнем у Маскве і Пецярбургу, да гэтага паўстаньня заклікаў усіх рабочых.

У 1906 годзе пасьля няўхільнага ўдзелу IV-га (аб'яднаючага) зьезду партыі ён зноў вяртаецца ў Расію; наладжвае сувязь з кіраўнікамі Кранштацкага і Свіаборскага паўстаньня, агітаваў сярод рабочых і прымаў усе меры, каб перанесьці рух у Пецярбург.

У 1907 г. пасьля зьнішчэньня рэволюцыі Ленін накіроўваецца ў другую эміграцыю заграніцу, дзе знаходзіўся да 1910—11 гг.

Там ён выдаваў нелегальныя газэты, пісаў палітычныя кнігі, езьдзіў з конфэрэнцыі на конфэрэнцыю і наагул вёў змаганьне з ворагамі працоўных.

У 1912 г. Ленін едзе бліжэй да Расіі ў Галіцыю, каб лягчэй было даваць належныя кірункі ачуняламу, узмацнёнаму рабочаму руху, які перацярпеў шмат у 1905—6 г г.

Як толькі стварылася першая «Лютаўская» рэволюцыя Ленін пасьля 10 ці гадовай эміграцыі вярнуўся ў Расію.

Ён адразу ўзяўся за працу, каб зьнішчыць урад Керанскага і заснаваць Урад Рабоча Сялянскі, што, як нам ведама, зьдзейсьнілася.

Урадам Керанскага быў даны загад аб арышце Леніна. Таму, хто зловіць Леніна, абяцалі нагароду 100 тысяч.

Ленін хаваўся сярод балот у Фінляндыі, адкуль ён кіраваў падрыхтоўкай і ходам Кастрычнікавай рэволюцыі. У гэтыя дні ён ня толькі артыкуламі кіраваў рэволюцыяй, але камандаваў, як галоўнакамандуючы, усімі атрадамі рэволюцыйнага працоўнага фронту. 30-х гадовая бязупынная рэволюцыйная праца, часамі голад і холад, замеры панскіх прыхвасьняў застрэліць Леніна, зусім падарвалі яго здароўе.

На старонках усясьветнай гісторыі рэволюцыйнага руху занатавана жалобнымі літарамі:

У сераду 21 студзеня а 6 г. 50 м. увечары 1924 г. у г. Горках, каля Масквы, памер Уладзімір Ільліч Ульянаў-Ленін—правадыр працоўных усяго сьвету.

Апошні рэйс.

У глыбокую марозную ноч паехалі «Старэйшыя» бальшавікі туды, адкуль трэба было ўзяць нярухомае цела памёршага правадыра. Прывезьці і паказаць яго асірацеўшым міліёнам.

Паехалі коньмі ад станцыі да ляснога ўзвышша, дзе стаяў невялікі будынак.

Будынак ціхі, прасторны.

Тут кожная пядзь—гісторыя. Вось тут у крэсле на калёсіках ён сядзеў, перадзьвігаўся, цярпліва пробаваў ачуняць, каб зноў працаваць. Ачуняць, каб ашчасьлівіць бессупярэчна чакаючых звароту правадыра пролетарскіх мільёнаў.

Сюды, у вялікі пакой, прыходзілі да дзядзькі Леніна сялянскія дзеці—пасядзець, пакуляцца праз галаву на дыване, атрымаць усьмешку, яблыка і цацку ў падарунак.

Стаіць ня вынесеная хвойка ў маністах, пацярках, сьвечках і бавальняным «нумарачком»—апошняя забава маленькіх сяброў.

Круглыя ўсходы на верх. Ціха!

У цёмным праходным пакоі, на канапе Надзея Канстантынаўна, жонка, сябра, вечны беззаменны таварыш. Як заўжды на сваёй варце, у расчыняных дзьвярэй пакою Ільліча. Так каменнарэзкія, апаўшыя рысы твару,— але моцная бальшавіцкая парода: проста, уважліва, зразумела адказвае кароткімі словамі падсеўшаму. Марыя Ільлінічна—тая не сядзіць, а ўсё ходзіць, ходзіць прамой цьвёрдай паходкай па паверхах і пакоях асірацелага будынку.

Вось ён! Зусім не зьмяніўся. Як пахожы на сябе! Твар спакойны, амаль—амаль ухмыляецца непаўторнай, непераказнай зразумелай тым, хто бачыў, дзіцячай усьмешкай; задорна, зусім пажываму, прыпаднята верхняя губа, парослая вусамі Нібы сам верыць у тое, што здарылася.

Ленін, а нярухомы, не махае рукой, ня бурліць, ня бегае вясёлымі кароценькімі крокамі.

Ленін, а ляжыць, безнадзейна і прама, рукі па швох, плечы ў зялёным фрэнчы.

Ідучы ўніз па сходах, бальшавік—вайсковы бармоча, пра сябе:

— Добра выглядзіць Ільліч Зусім такі, як бачыў яго ў апошні раз.

... Старыкі. Яны панура разьмеркаваліся на канапе.

Перабіваюць адзін другога, усё ўспамінаюць Яны адпаведныя працаўнікі вялікага савецкага саюзу, якім кіраваў Ленін

Яны начальнікі буйных дзяржаўных установаў, тых, у якіх геній Леніна, палітыка і барацьба развярочваўся з найвялікшай моцай.

Але цяпер яны—толькі—старыкі і пастарыкоўску ўспамінаюць аб Ленінскіх жартах, яго стойкасьці і інш.

Зусім сьветла. Зьнікла ноч. Пара адсюль адыходзіць—Леніну і ўсім. Чырвоная труна плыве ўніз па сходах. Моўчкі, без сьпеваў, вынеслі. Апусьцілі на зямлю.

Мінута невыказанага гора, вот такога гора, якое цяпер пабяліла гіпсам твар і запаўшыя вочы Сталіна, які схіліўся над труной.

Трэба зачыняць шкляную крышку. Сьняжынкі валяцца на адчынены лоб і губы Ільліча Накрываюць. Плачуць. Бальшавікі плачуць. У перадзе на развалках мужычок насыпае ельнікам шлях.

Наўкола, па ўзгорках сяляне, бабы, дзеці. Барадачы, упёршыся ў сьнег доўгімі віямі, спачуваючы, спакойна праводзяць вачыма па вызначанай ельнікам дарозе.

— «Добры чалавек быў Ленін. Акрамя добрага, нічога нам, мужыком, не зрабіў».

Нясем. Ужо жаўцее будынак станцыі. Адтуль, пачынаючы з палата чыгункі, чакае Леніна пролетарыят усяго сьвету: Эўропа, Амэрыка, тэлеграф, радыё, нечаканая жалоба рабочых кварталаў усіх, усясьветных сталіцаў.

Гэтыя 5 вёрстаў пехатою, па «цянькох»—Наша рэволюцыя, яе тысячавёрсты размах па-над сьнежнымі пустэльнямі, яе суровая стыхія, узбуджаная і напраўленая вялікім Леніным, жалезным правадыром рабочых, правадыром і сябром сялян,

Ленін абаронец прыгнечаных.

Вестка аб сьмерці Леніна маланкай прабегла па вялікай Авіі, знойнай Афрыцы, даведаліся аб сьмерці Леніна і чорныя і жоўтыя народы.

Яны ніколі ня бачылі Леніна; яны ня ведаюць нават, дзе знаходзіцца гэтая далёкая Расія,—тым ня менш моцна засмуціліся яны атрымаўшы жалобную вестку.

Даўно ўжо яны даведаліся аб тым, што недзе далёка ў халоднай Расіі просты, з мазольнымі рукамі народ прагнаў ад сябе

дэспота цара, скінуў ярмо капіталу-насільніка, жыве вольна, карыстаючыся з сваёй працы. Даведаліся прыгнечаныя, што на чале іх стаяў волат, імя катораму—Ленін. Але гэта яшчэ ня ўсё:

«дайшла да іх вестка, што гэты вялікі чалавек, вызваліўшы сваіх, прагнецца вызваліць і другія народы. Ен нават кліча белых дапамагчы жоўтым і чорным вызваліцца з пад ярма паноў...

Даведаліся яны, што ёсць комуністычная партыя, Комуністычны Інтэрнацыянал і, што на чале іх стаіць ён—Ленін.

Так гаворыць аб сьмерці Леніна прадстаўнік прыгнечаных народаў, комуніст з Інда-Кітаю т. Нгуэн Ак-Кваз.

Нам зразумелы гэтыя простыя словы, бо мы ведаем, як цяжка жывецца прыгнечаным нацыям, як цяжка ім згубіць такога правадыра, як Ленін. Царская Расія—турма народаў—ня толькі накіравала ўсе сілы вялікага розуму Леніна, на вызваленьне пралетарыяту, але і на вызваленьне тых, каго праззалі «інародцамі». А іх шмат было ў Расіі, больш 50 процантаў, (каля соткі міліёнаў жыхароў). Іх эксплёатаваў капітал, ім няможна было гаварыць і вучыцца на родных мовах. Для іх організоўваліся пагромы, іх атручвалі царскай гарэлкай. Ціхаю, няўхільнаю сьмерцю выміралі яны.

Так было ня толькі ў Расіі, «Культурная» Эўропа таксама пабудавала імпэрыялістычныя дзяржавы, якія жывуць сокамі «адсталых» Азіі, Афрыкі і Аўстраліі.

Але пачалі прачынацца прыгнечаныя. З вялікай радасьцю вызначае У. І. Ленін гэты факт у сваім артыкуле «пробужденіе Азіі» (XIX т. стр. 25):

«сучасны капіталізм і Рускі рух 1905 г. канчаткова абудзілі Азію. Соткі міліёнаў забітага, адзічэлага ў сярэднявяковым застоі насяленьня прасвулася да новага жыцьця і да барацьбы за элементарныя правы чалавека, за дэмократыю» (XIX т., ст. 26).

— У гэты самы час—далей гаворыць Ленін—«цывілізованая»Эўропа кінулася пад абарону рэакцыі, ваеншчыны і паўшчыны. Яна зьлякалася падняўшагася колёніяльнага руху прыгнечаных нацыяў з аднаго боку і социяльна - рэволюцыйнага руху пролетарыяту з другога боку.

Шмат прышлося пісаць і гаварыць Ільлічу па пытаньню аб самавызначэньні нацый. Ленін зьвязаў нацыянальнае пытаньне з колёніяльным у той час, як да яго, гэтай сувязі не рабілася.

Ленін акрамя гэтага, нацыянальнае пытаньне паставіў на грунт інтэрнацыянальнай, клясавай барацьбы, зьвязаўшы яго з міжнароднай пролетарскай рэволюцыяй і дыктатурай пролетарыяту. Замест адзінага нацыянальнага фронту ўтвараецца адзіны клясавы фронт.

Саюз ССР, пабудованы згодна вучэньню Леніна. Самым малым, самым непрыкметным і адстаўшым у сваім жыцьці народам знайшлося месца ў савецкім саюзе молата і сярпа. Яны ўвайшлі ў склад яго не як калёніі, а як асобныя рэспублікі.

Так ніколі-б не зрабіла буржуазія

Сканаў вялікі абаронец прыгнечаных нацыяў і пролетарыяту ўсяго сьвету. Але пасьля яго засталася яго навука і партыя. Будуецца моцны саюз ССР, у якім няма соцыяльнага і нацыянальнага ўціску. Шпаркім крокам ідуць уперад за пролетарыятам адсталыя народнасьці.

Ажыцьцяўляюцца словы прамовы Леніна на 2 м конгрэсе Комінтэрну:

«З дапамогаю пролетарыяту найбольш перадавых краёў адсталыя краіны могуць перайсьці да савецкага строю і праз пэўныя ступені разьвіцьця—да комунізму, мінуючы капіталістычную стадыю разьвіцьця.

Хто быў ні чым, той будзе ўсім!»

Ленінамайскае.

Май—басаногі хлопчык Валодзя
Песьні слухае Волгі шырокай,
Май —Ленін на дымным заводзе
На трыбуне з прыжмураным вокам.

Вечны Май... У чырвоным убраньні,
У вачох океан срэбрасіні...
Ен сяголньня жалобай параневы,—
Вэльмам чорным над ім навіс іней...

Песьня-плач, песьня-кліч вызваленьня
Увесь сьвет зачаруе сяголньня...
І памоляцца зноў перад Ленінам
Вольны скіф і нявольнік колёній...

Май цяпла—закалосяцца нівы,
Май сьвятла—сонца грае у палех...
Я сяголньня шчасьлівы, шчасьлівы,
Што па сьвету Май песьняй разьлег.

Слухай, Май! Вясны ты любоўнік,
Тэй вясны, што з чырвонай травы...
Паміж сьцягамі Леніна помнік,
Мне, здаецца, што Ленін жывы.

Мне, здаецца,—з драўлянай трыбуны
Ен на захад кіўнуў галавою...
На загонах там ветрана-буйных
Вольны Май задажджыўся крывею...

Погляд Леніна ловяць міліёны,
Погляд Леніна маева-прамністы...
А там... хмары скудлачаным ленам
Над Немнам навісьлі імглістым.

Май у пушчы зарошчай чуць звоніцца.
То паўстанцкай зямлі пакаленьне...
Там... у кожным промені сонца
Ловяць погляд няўмершага Леніна.

Май шапоча сьцягамі—лісьцем
Аб краіне квяцістай і вольнай...
Неман гойсае, нібы у калысцы,
І таксама пяе аб раздольлі...

А тут... паміж хваляў маевых
Я на Леніна помнік глядзеў...
Мне, здаецца, вось-вось скажа словы
Шматміл'еннай сваей грамадзе...

Ен жыве—адгалосам няслося—
Будзе жыць сонцавеючым Маем.
Бо Май і Кастрычнік увосень
Памяць вечна аб ім уздымае.

Май—басаногі хлопчык Валодзя
Песьні слухае Волгі шырокай,
Май—Ленін на дымным зоводзе
На трыбуне з прыжмураным вокам.

М. Чарот.

Ленінскі комсамол за працаю.

(Ячэйка в. Васільчыцы, Слуцкае акругі).

Ячэйка організавана ў сьнежні 1923 г., зацьверджана акруговым камітэтам у красавіку 24 г. Працуе яна такім чынам роўна год. Знаходзіцца ў 4-х вярстох ад цэнтру—сельсавету.

Рост ячэйкі

ішоў за лік беднаты. У сьнежні было 7 сяброў. Пасьля сьмерці Леніна ў ячэйку ўвайшло 2 батракі. Цяпер налічваецца 15 сяброў ячэйкі і пяць яшчэ не зацьверджаны акруговым камітэтам.

Склад ячэйкі.

Склад ячэйкі гэтакі: сялян беднякоў—10, серадвякоў—2, рабочых саўхову—2, батракоў—1. У ячэйцы 1 дзяўчына. Беларусоў—14, палякоў—1.

Бюро ячэйкі.

Бюро ячэйкі складаецца з 3-х таварышоў. Сакратар ячэйкі сам вядзе гаспадарку, на якой працуе разам з братам. Разам з гэтым ён старшыня камітэту ўзаемадапамогі. Адзін сябар бюро—рабочы саўхозу, організаваў па загаду ячэйкі пажарную дружыну ў саўхозе. Другі сябар бюро—батрак. Вызначаны для працы сярод батракоў. Кожны сябар ячэйкі мае пэўна вызначаную працу, напрыклад: 2 абраны ў сельскі савет, 1—абраны старшынёй камітэту ўзаемадапамогі, 1—абраны старшынёй рэвізійнай камісіі камітэту ўзаемадапамогі, 2—прадстаўнікамі ў сельскі савет, 1—прадстаўнік у школьную раду, 1—прадстаўнік у копэратыў, 1—упаўнаважаны па працы сярод батракоў, 1—корэспондэн, 3—сябры рэдакцыйнай колегіі насьценай газэты, 1—кірує колектыўнай чыткай газэт, 1—профэсыянальны ўпаўнаважаны па працы сярод працаўнікоў зямлі і лесу ў саўхозе, 1—кірує палітычным гуртком.

Політасьветпраца

вядзецца ў гэтак званым клюбе (пакой у хаце аднаго кулака, узяты па ордэру РВК). Політгурток вядзе комсомолец па кніжцы Яраслаўскага. Агульна-асьветны гурток вядзе настаўнік. У гуртку ўсе комсомольцы і 8 чалавек беспартыйных з якіх 2 дзяўчыны. У гуртку вучаць беларускую мову прыродазнаўства, географію. У сельска - гаспадарчым гуртку займаюцца па кніжцы „Комсамолец за плугам“. У гэтым гуртку 15—20 старых сялян акрамя моладзі. Кіраваць гуртком быў запрошаны загадчык саўхозу, але ён ні разу ня прышоў. і гуртком кірує сябар ячэйкі. Чытка газэт праводзіцца раз у тыдзень. Чытаюць: „Малады Араты“, „Савецкая Беларусь“, „Беларускую Вёску“, „Красную Смену і „Крестьянскую газэту“. 2 разы ў месяц выпускаецца насьценная газэта. Пішуць у газэту ўсе комсамольцы, бо гэта лічыцца комсамольскім абавязкам.

Удзел у грамадзянскім жыцьці.

У сельскі савет абраны 3 камсамольцы, з якіх адна дзяўчына. Ва ўсёй працы сельсавету праводзіцца лінія партыі праз комсамольцаў. Па здачы сельскагаспадарчага падатку, сельсавет стаіць на адным з перадавых месц. Па ініцыятыве ячэйкі ў цэнтры сельсавету організавана хата-чытальня і пажарная дружына. Будуецца новае памяшканьне для школы. Старшынёй сялянскага камітэту ўзаемадапамогі—комсомолец. Пайшчыкаў маецца 89, з іх 10 серадвякоў, рэшта бедвякі. Уся бедната камітэтам узята на ўчот і ім даецца дапамога.

Ячэйкай восеньню організавана „Вобчаства тарпяных разработак“. Сьціслая гісторыя організацыі, яна гэткая: сакратар ячэйкі быў на павятовай конфэрэнцыі ЛКСМБ; па сканчэньні конфэрэньцыі ён трапіў на 12 партконфэрэнцыю, дзе казалася аб тым, у якіх паветах неабходна пачаць працу па распрацоўцы торпу, у тым ліку была памянута воласьць, дзе знаходзіцца й ячэйка.

Прыехаўшы ў вёску сакратар некалькі разоў падымаў пытаньне перад сялянамі, каб запрасіць інжанэра — меліоратара (меліорацыя—асушка забалочаных мясцовасьцяў), але заўжды бяз вынікаў. У жніўні м-цы выпадкова заехаў у вёску інжанэр—мэліоратар; сакратар дагаварыўся з ім, вырашылі пытаньне і вывучылі магчымасьці працы.

У першых днёх жніўня ўсе комсомольцы вышлі на працу. Адных комсамольцаў было мала. Запрасілі рэшту сялянства, абяцаючы ім заплаціць грашыма за працу. У працягу трох дзён, пры ўдзеле некаторых сялян, было здабыта 11 кубаў торпу. Частка торпу была прадана і заплачана сялянам за працу, а рэшту комсомольцы ўзялі дзеля апалу клюбу.

За праробленую працу „торп-таварыства“ ў дзень ураджаю на сельска-гаспадарчай выстаўцы атрымалі прэмію: 1 плуг і 4 пуды фосфаравай мукі.

Сялянства раней адносілася недаверчыва да працы і не хацела ячэйцы дапамагчы. Але калі ім заплацілі, дык яны былі згодны працаваць далей, хоць і дарэмна. У зьвязку з гэтай працай значна падняўся аўторытэт ячэйкі і цяпер сяляне кажуць: „калі камсамол узяўся за справу, дык нешта добрае будзе“- Комсамольскай ячэйцы давераюць ва ўсім.

Камсамол на сходах.

сялян прыймае чынны ўдзел. Усе комсамольцы актыўна абгаварваюць усе пытаньні. Ячэйка выступае організавана. Бедната ідзе за ячэйкай і да прапазыцыяў ячэйкі, заўжды далучаюцца, гаворачы, што комсамол промаху ня дасьць.

Масавая праца

У працягу 4-х м-цаў правялі некалькі сходаў сялянскай моладзі. На апошнім сходзе моладзі было ўжо ў тры разы больш, чым на першым. Комсамольцы ходзяць на вячоркі, каб весьці працу сярод дзяўчат. Чытаюць газэты, кнігі, журнал „Работніца і Сялянка“. У зьвязку з гэтым у агульна-асьветны гурток залічылася 12 дзяўчат.

Праца сярод батрацтва.

Ячэйка ўзяла на ўчот 10 батракоў. На 7—з іх гаспадарамі зроблены дагавор. Праведзена праца аб уваходзе іх у саюз Рабземлесу. Дзеля працы сярод батракоў выдзелены комсамолец. Было 2 выпадкі, калі гаспадары меркаваліся абыйсьці некаторыя пункты дагавораў, але ячэйка падтрымала батракоў.

Настроі і быт.

Ячэйка стала цэнтрам усяго жыцьця ня толькі вёскі Васільчыцы, але ўсяго сельсавету. У вёсцы п'янства няма зусім. Самагону ня гоняць. Да рэлігіі сялянства пачынае адносіцца зусім холадна. На вялікія сьвяты ніхто ня хоча ехаць за папом, каб адслужыць малебен.

І комсамаольцы працуюць на гаспадарцы, а вечарам прыходзяць у клюб. Рэшта моладзі прыходзіць у клюб, ці ходзяць на вячоркі, некаторыя сядзяць дома. Вечарынак ня бывае.

Адчуваецца, што ячэйка хыша жыцьцем і комсамольскай бадзёрасьцю.

Па комсамольскіх весках.

Ленінскі комсамол на весцы

ПЕРШЫ ВОПЫТ

(Шацкі раён).

Увес час гавораць аб скарыстаньні дзявочых вячорак. У ячэйках нашага раёну гэта яшчэ не практыкавалася.

І вось наша, Шацкая ячэйка, зрабіла першы вопыт у вёсцы Лявонаўцы.

Вечарам дзяўчаты сабраліся ў адну хату, на комінку ярка гарыць смоль—цёпла і відна-

Зайшлі ў хату местачковыя комсамольцы, дзяўчаты перашоптваюцца:

— «Мусіць нешта чытаць будуць?!».

Прышлі таксама вясковыя хлопцы, людзей сабралася шмат.

У першую чаргу правялі гутарку: «Аб адносінах дзяўчыны да комсамолу. Урэшце, прачыталі некалькі апавяданьняў аб жанчынах.

Дзяўчаты пачалі, ўрэшцэ, даваць пытаньні, на якія самі яны без комсамольцаў не адкажуць.

Увесь вечар скарысталі добра. У другі раз спадзяемся людзей зьбярэцца больш.

Зычу каб гэтакім чынам спрабавалі працаваць зімой і другія ячэйкі.

Іоха.

Узяліся за працу.

(В. Селішчы, Слуцкай акругі).

Значна пагоршала праца нашай ячэйкі ў перыод так званага бяспрытульля. Ды яно і праўда. Зьбярэцца кучка комсамольцаў на дарове і пытаюцца адзін у аднаго: ну, хлопцы, куды ісьці на сход? Здаецца, сэкратар казаў к Гаўрусёвым, Сказана, зроблена, пашлі комсамольцы к Гаўрусёвым. Прышлі, пацалавалі клямку ды пашлі бяз ведама: ці быў які сход, ці не. Гэтак было аж да сьнежня м-ца. Ня тое ўбачыў наш кожны комсамолец, адчыніўшы свой комсамольскі клюб. Цяпер ня будзем блудзіць, а будзем ісьці ў свой пэўны будынак, каб хутчэй узяцца за працу. З адчыненьнем клюбу, прачнулася і ячэйка. Яна скоро ўзялася за працу: наладзіла чытку лекцый, якія вяліся і раней. Павяла шырокую працу ў гуртках, арганізавала ячэйку МОПР'у, у якую запісаліся ўсе члены ячэйкі і шмат беспартыйнай моладзі і шмат чаго іншага.

А. Л.

Барацьбітом рэволюцыі.

Вучні, у Мопр!

(Узьдзенская 7-х гад. школа, Менскай акр.)

У нашай 7 годцы спачатку працы ў школе склалася комсамольская фракцыя ў ліку 0 ці чалавек. Усю грамадзкую працу вядзе комсамол. Нядаўна комсамольцы наладзілі даклад аб МОПР'у, які зрабіў адзін з комсамольцаў вучняў. Пасьля дакладу заснавалі ячэйку МОПР'у; праз тыдзень амаль усе вучні сталі сябрамі ячэйкі.

2 студзеня на агульным сходзе сяброў яч. МОПР даклад рабіў прадстаўнік раённага бюро т. Трыгубаў.

Вучкор.

Больш увагі весцы!

(Журавіцкі р., Магілёўскай акр.).

У Журавіцкім раёне маецца райорганізатар т. Наймарк, якога калі хочаш спаткаць яго, дык у любы час у горадзе будзе, а на працу сярод вясковых ячэек ён звярачвае мала ўвагі

У горадзе ёсьць парт ячэйка, якая можа накіраваць працу ячэйкі ЛКСМ у часе адсутнасьці райорганізатара, у вёсцы-ж гэтага няма.

Больш увагі вёсцы, таварышы!

Комсамолец.

Раены Вык, зьвярні увагу!

(м. Узда, Менскай акр.).

У м. Уздзе ёсьць нардом імя Сталіна, перад ганкам якога вартаўнік Гарбачэнка зьлівае ўсякі бруд, цэлая мора стварыў памыямі.

Хутка ніхто ў нардом зайсьці ня зможа.

Раённы Выканаўчы Камітэт і загадчык нардому, зьвярнеце ўвагу!

Б. Пятроўскі.

Ленін да моладзі.

3-му Усясьветнаму Конгрэсу Інтэрнацыяналу Моладзі

Дарагія таварышы!

Шкадую, што не магу вітаць вас уласьціва. Шлю вам самыя лепшыя пажаданьні посьпеху ў вашай працы. Спадзяюся, што, ня гледзячы на высокае званьне вы не запамятаеца самага галоўнага — неабходнасьці дзелавым чынам крануць уперад падрыхтоўку моладзі і вучэньня.

З самым лепшым комуністычным прывітаньнем

Ул. Ульянау (Ленін).

Прывітаньне пятаму зьезду РКСМ.

Вельмі шкадую, што не магу ўласьціва вітаць вас. Жадаю ў працы вашага 5-га зьезду ўсякага посьпеху. Упэўнены, што моладзь зможа разьвівацца так пасьпешна, што да часуназраваньня ідучага моманту ўсясьветнай рэволюцыі скажацца цалком на вышыні задачы.

З гарачым комуністычным прывітаньнем

Ул Ульянаў (Ленін).

Зьмена Ленінскага комсамолу.

Піонэрыя расьце.

(в. Каменка, Узьдзенскі р.)

У нашай вёсцы організаваўся атрад піонэраў, якія вядуць працу сярод дзяцей суседніх вёсак.

Атрад налічвае 40 дзяцей: з іх 4 батракі, рэшта—дзеці беднейшага сялянства. Бацькі з ахвотаю пушчаюць сваіх дзяцей у атрад. Быў, напрыклад, гэтакі выпадак:

Адзін бедняк прыводзіць 2-х сваіх дзяцей у школку, дзе запісуюць у піонэры ды кажа:

— «Запішэце, калі ласка, маіх хлапцоў, толькі, каб іх адвучылі курыць ды сабак ганяць па вуліцы».

Цяпер піонэрскі рух пашыраецца, сяляне да яго адносяцца прыхільна. Шкода, што няма піонэрскай літаратуры. А.Пушкарчук

Атрад пашыраецца.

(М. Капыль, Слуцкай акр.)

Організаваўся наш піонэрскі атрад у ліку 8 чалавек, хутка мы выраслі і цяпер налічваем 100 піонэраў. Памяшканьне мы здабылі сабе дзякуючы комсамолу.

Працай нашай кіруе комсамолец. Чытаюць нам лекцыі, ставім спэктаклі, як у м. Капылі, гэтак і ў суседніх вёсках.

Піонэр А. М.

Кулацкі разгул.

Яшчэ афяры.

23 сьнежня 24 году Мінакружком атрымаў вестку, што з Ратамскай ячэйкі, Заслаўскага раёну, зьнік т. Гірэвіч Уладзімір.

3 студзеня г. г. пасьля доўгага шуканьня найшлі Гірэвіча Ул. забітым недалёка ад вёскі Тарасава ў забалочаным хмызьняку

Труп з'уродаваны: левая нага ад'едзена зусім, частка жывата і ўнутранасьці выцягнуты наверх частка правай нагі таксама ад грызена. Відаць працавалі клык ваўкоў ды сабак.

У роце пясок—сьведка таго, што злачынцы душылі яго пяськом.

Па справе забойства арыштавана некалькі чалавек.

Ш.

Тэлефонаграма з Барысаўскай акр.

У Бярэзінскім раёне Барысаўскай акр.—забіты комсомолец Рыбачонак Мікола (20 год.) з Багушэвіцкай ячэйкі, жыхар вёскі Асмолаўка. Забойства адбылося на політычным грунце.

Раней, чым забіць забойцы здзекваліся над афярай: давілі за глотку, білі.

Урэшце разьбілі каменем чэрап.

Сэкратар Барысаўскага акружкому ЛКСМБ Раманчук.

Справа селькора Лапіцкага.

Зараз па дырэктыве ЦК КПБ праводзіцца давнаньне па справе селькора Лапіцкага. Злачыннасьць абвінавачаных Аўсянікава, Дамброўскага і іншых была ўстаноўлена яшчэ з самага пачатку сьледзтва. На падставе гэтага ЦК КПБ 6 сьнежня 1924 г. пасьля заслуханьня дакладу камісіі з прадстаўнікоў ЦКК і пракуратуры даў дырэктыву аб наладжаньні шырокага адкрытага працэсу. Матар'ялы камісіі ад газэты «Праўда» выяўляюць шмат новых момантаў. Праводзіцца давнаньне па пытаньню аб працы Лапіцкага, як селькора, яшчэ ў 1923 г. і аб прычынах, выклікаўшых напады. Працэс павінен пачацца ў першых лічбах лютага. Грамадзянскім абвініцелем ад ЦК КПБ назначаецца рэдактар „Звезды“ т Нодэль. Таксама выступіць грамадзянскі пракурор ад «Праўды».

Да працэсу прыўрочваецца другі ўсебеларускі зьезд селькораў.

Ленінскі комсамол шырыцца



Хочуць хлопцы ў сваёй вёсцы ліквідаваць няпісьменнасьць

Сучасны студэнт свае веды не хавае а дзеліцца імі пры першай магчымасьці.

З аднэй ячэйкі сталася тры.

(Хатаўшчынская яч., Жураўскі раён).

У нашу ячэйку залічыліся хлопцы з суседніх вёсак—за 4—8 вёрст ад ячэйкі.

Цяпер у гэтых вёсках маюцца свае ячэйкі. Організаваны яны ў в. в. Зімніцы і Іскані, хлапцамі з нашае ячэйкі, якія там жывуць.

Ідэі Ільліча распаўсюджваем.

К. Грэкаў.

Студэнты ў вотпуску.

(Нізаўская ячэйка).

Прыехалі хлопцы з вучобы разу за працу ўзяліся. Разам з комсамолам працуюць сярод моладзі. Прыходзяць у школу, робяць даклады, чытаюць кніжкі зразумелае тлумачаць моладзі. Некаторыя дапамагаюць павады піонэрскага атраду, працуюць сярод піонэраў асабліва Трус П.

Дайце раду.

(г. Слуцк).

У Слуцку ёсьць электромашына. Тарахціць, аж перапонкі лопаюць, а прыдзі ў хату ці 7-х галовую школу, дык цёмна, „хоць вока выкалі“.

Калі ёсьць у хаце газа, дык і сьвет ёсьць, а няма — тады вядомая рэч: ідзі ў краму купляць газу.

Нярэдкі такія выпадкі: двём гарыць электрычнасьць, а надыйдзе вечар, раптам лямпка да чарговага дню гасьня, што рабіць? «Малады Араты», дай раду.

Вазьмі гэту штуку пад каўпак.

Р. Ліс.



Да ведама падпісчыкаў.

Карэспондэнцыі накіроўваць на адрэсу

Менск, Камсамольская в. 25

Рэд „Малады Араты“

Школа у Заходняй Беларусі.

(Ліст з Заходняй Беларусі).

Кожны грамадзянін Савецкай Беларусі ведае, якое цяпер становішча селяніна ў Заходняй Беларусі. Яго культура, школа прыгнечваюцца, забараняецца ўжываць сваю матчыную мову ў польскіх установах і г. д.

Магу я перадаць некалькімі словамі з майго жыцьця ў мястэчку Т. Заходняй Беларусі.

Беларускую школу ў нашым мястэчку зачынілі, настаўніка прагналі, а замест яе адчынілі школу „panstwowu“ т. зв. (польская школа) з чужацкай мовай. А на места настаўніка паставілі нейкую тутэйшую шляхцянку, якая нават сама нічога не разумела. У польскую школу сяляне не хацелі пускаць сваіх дзяцей, яны дамагаліся адчыненьня беларускай школы. Паліцыя пачала хадзіць па хатах і зганяць дзяцей у школу пад пагрозай штрафаў.

2 тыдні ў ложку з разьбітай галавой за таблічку множаньня. Ставіў таксама на „каленкі, падсыпаючы пад іх грэчку або гарох. Гэтак ён толькі абыходзіцца з дзяцьмі беларускага беднага селяніна. А з дзяцьмі абшарніваў жыў у згодзе „кохал польскіх патрыётаў“, кулакоў.

З прадметаў выкладаньня ў пачатковай польскай школе, наагул па ўсёй Панскай Польшчы высіцца найбольш «рэлігія». Выкладае гэту «навуку» ксёндз. Гэты яшчэ горш, як настаўнік зьдекуецца над вучнямі, карае рознымі спасобамі. Яшчэ выкладаюць найбольш гісторыю «Польскі», танцы, сьпевы „Nie zucim zumi“. „Яшчэ Польска ня згінела“ і іншыя. Нарэшце „Тугут“ выдаў т. зв. законы «языковыя», але гэта толькі баламучаньне вачом ды коіны над намі. І калі сяляне мястэчка і вёскі ад-

Такім чынам і я апынуўся ў польскай школе. Вучэньне такое. Адзін раз, на лекцыі аб „дзеях Польскіх“, ішла гутарка аб Польскіх „крулях“. Вядома, настаўніца пачала вельмі разхваляць гэтых крывапійцаў на роду. Тады я ня ўстрымаўся і крыкнаў: «усе яны трутні працоўных».

Настаўніца за гэта палажыла мяне „krzyzem“ (гэта значыць, легчы сярод клясы тварам да гары, або ўніз, выцягнуўшы рукі і ногі, як крыж). Гадзін каля двух настаўніца бушавала, лаючы мяне і ўсю клясу.

Настаўніца таксама забараняла ўжываць беларускую мову ў школе, называючы яе „хамскай“. Потым зьмяніў яе другі настаўнік „патрыёт“ з Галіччыны, ён любіў біць палкаю і біў дзе папала. Адзін вучань ляжаў

нагалосна ўхвалілі адчыніць беларускую школу, дык школьны «інспэктар» ня толькі ня даў дазвалу, але ў згодзе з войтам зрабіў данос, абвініўшы сялянскага дэлегата — «халака» ў бальшавізму. Паліцыя пачала цягаць нявіннага таварыша. Вобыскі пашлі чуць ня кожны дзень. Пачалі пытаць: чаму чытае беларускія кніжкі? Чаму газэта „Сялянская Праўда“ ды «Трыбуна Роботніка», а не «газэты Варшаўскія» і іншае.

Ня стрывала моладзь 14—15 год, у партызаны вя прымуць, трэба шукаць дзе-небудзь школы і разьбягаецца моладзь з вёсак, марачы аб вольным і шчасным жыцьці на ўсходзе ў БССР.

Заходняя Беларусь
1924 г.

В. Клінцэвіч.

Хутка выйдзе часопіс сялянскай моладзі.

Рост тыражу газэты «Малады Араты» і запатрабаваньні чытачоў праз лісты ў рэдакцыю, што трэба павялічыць «Малады Араты», знайшлі належнае вырашэньне.

„Малады Араты“.

—газэта, якая была разьлічана на сялянскую моладзь, каб падрыхтаваць, выхаваць яе ў належным, комуністычным напрамку, каб вывясьці, працерабіць шлях да новай вёскі,—адпавядаў сваім запатрабаваньням. Вясковыя комсамольскія вечары, сьпевы частушак, рэволюцыйных народных сьпеваў, сьпэктаклі,—усё гэта ў большасьці было працай **„Маладога Аратага“**.

Цяпер калі запатрабаваньні моладзі большыя, калі комсамолец хоча ахапіць болей ведаў, калі павялічыўся тыраж дык ёсьць магчымасьць замест газэты «Малады Араты» выпусьціць **«Часопіс Сялянскай Моладзі»**.

Часопіс сялянскай моладзі—2-х тыднёвае выданьне зможа выходзіць тады ў азначаны тэрмін, калі моладзь усёй Беларусі будзе падтрымоўваць. На абавязку кожнага чытача і корэспондэнта належыць і пашыраць друкаванае слова, павялічаць падпіску—ад гэтага залежыць кошт часопісі,—чым большы тыраж часопісі, тым танней яна будзе каштаваць. Чым больш корэспондэнтаў, тым багацей па матар'ялу часопісь.

Моладзь, вёскі!

Усе, як адзін, падпісацца на часопіс сялянскай моладзі! Моладзь, гораду!

Дзяля хутчэйшага ажыцьцяўленьня змычкі гораду з вёскай, выпісвайце часопіць сялянскай моладзі.

На старонках гэтай часопісі яскрава будзе адбівацца жыцьцё сучаснай вёскі, яе патрэбы, посьпехі і іншае.

Першы нумар хутка выйдзе. Усе падпісчыкі, якія падпісаліся на „Малады Араты“, замест газэты будуць атрымоўваць часопісь.

Хто непадпісаўся на часопіс, падпісвайцеся.

Рэдакцыя часопісі сялянскай моладзі ўпэўнена, што комсамольская Беларусь 20-х тысячнай глоткай прагрымíць:

„Даеш часопіс сялянскай моладзі!“.

Нечаканае на рэдкасьці.

(В. Раўнапольле, Сьмілаўскага р.).

У нашай вёсцы каля хаты-чытальні пераменьнік 1902 г. Алесь Бірульчык адчыніў карцёжную.

Прыходзяць да яго з суседніх вёсак усе, хто капейку ўрвець, ды да картаў ахвоту мае.

Часамі прайграецца Бірульчук, пачне цабры, міскі, усё што папала, застаўляць «да нітачкі».

За гульню па 3 капейкі плаціць.

Вось каўпак, дык дарам адвядзе куток для карцёжнікаў.

Мо' паразумнеюць крыху, а асабліва застрэльшчык Алесь Бірульчык

Комсамолец.

За самагонку ўсё.

(Караеўская мельніца, Рузенскі сельсавет).

Калі хто з багацейшых сялян спазьніўся прывезьці ў Караеўскую мельніцу першым муку, дык ведае, як раней за ўсіх змалоць сваё збожжа... Ня дарам штодзён нае п'янства адбываецца там. Багатыя сяляне „хабар“ самагонам даюць.

Міліцыя, у рэшце, загляні туды.

Селькор.

Сядзім у мора—чакаем пагоды.

(В. Рожава, Мсьціслаўскі р, Калінінская акр.).

У дзень ураджаю, у нашу ячэйку прышлі комсамольцы з райкому. Шмат чаго абяцалі: што шэфам у нас будзе коопэратыўны саюз, бібліотэка, газа, лямпы і шмат, шмат чаго.



Аж раты мы ад радасьці парасчынялі, кажам; печку жалезную будзем мець, холадна ў клюбе ня будзе...

Плывуць месяцы, як вада, ні шэфа і ні дапамогі нічога няма.

Ну і лоўка-ж пажартавалі комсамольцы з райкому.

Малайцы, хлопцы, хлусіць добра можаце.

А. Сокал.

АСІЛАК.

(Грозаўская 7-хгодка).

Як гэта цяпер жыць моладзі, каб ня чытаць газэты. Мы вось вучні Грозаўскай школы выпісваем „Малады Араты“. Хацелася-б ужо прывыкаць і да цэнтральных газэт, але «у кішэні вецер дзьме».

Выпісвае ў нас адзін, крыху багаты хлапец—Зянюк, Т. «Известия», пачытае крыху сам ды схавае. Як хто просіць пачытаць, дык ён хопіць за каршэнь трухане некалькі раз, аж сьвет у вачох закруціцца. Пасьля такой ператасоўкі тлумачэньні настаўнікаў у балючую галаву ня лезуць.

Мо' каўпак, прытуліць да сябе Зянюка і выхавае яго, каб ён ведаў, што газэту ад людзей нельга хаваць, хоць-бы і ён купляў яе сабе.

Залескі.

Ня жарты, а ліха нейкае.

(Капаткевіцкі сельсавет, Мазырскай акругі).

Усхапіўся ноччу селянін; „Што за ліха“—мысьліць—«дзе гэта з гарматаў паляць?..» Падышоў да вакна, прыгледзяўся. дык гэта моладзь гарбузы з яго страхі кідае, аж зямля стогне...

На другі вечар інакш намысьліліся хлопцы: узялі карыта, фанары, узлажылі на плечы і ідуць галосячы праз вёскі, пакойнікаў нібы хаваюць, спакою ў вёсцы не даюць.

Усеахапляючы, каўпак, прыкаўпач ты іх, асабліва комсамольцаў, якія заміж працаваць сярод моладзі, як другія комсамольцы робяць, цягаюцца і самі і другіх прывучаюць.

Юнкор З. Ш.

ПОШТА

КОМСОМОЛЬЦУ. Гэта цікава, выключна у насьценную газэту, напішы туды.

СКВАРЦОВУ. Перадаем у Наркамасьветы для разгляду справы на месцы.

МАЛЕВІЧУ. Спазьніўся крыху твой артыкул. На гэту тэму пісалі ужо.

ЧЫЖУ. Старайся пісаць у другі раз карацей, больш дзелавые менш літаратурнай вады, практычны матар'ял цікавей.

ЛЯХОЎСКАМУ. Калі няма грошаў, прысылай корэспондэнцыі без марак.

ГРЫБІНУ. Аб выпісцы кніг зьвяртайся у кнігарні Беларускага Дзяржаўнага выдавецтва.

„МАЛАДОМУ“ У „Маладняк“ пішуць усе, бо гэта орган ЦК ЛКСМ, які абслугаўвае патрэбы моладзі.

КРУЦІКУ. Ул. (Менск) зайдзеш у Рэдакцыю і пагутарыш, даведзешся што чытаць па вершаваньню.

КОРЭСПОДЭНТУ. Матар'ялы скарыстаем. У другі раз старайся пісаць карацей і на адным боку паперы.

Ўліт № 6471
3600 экз.